Нацыянальная платформа
Форум грамадзянскай супольнасці
УСХОДНЯГА ПАРТНЁРСТВА

# ЗАЯВА
# БЕЛАРУСКАЙ НАЦ ЫЯНАЛЬНАЙ ПЛАТФОРМЫ ФОРУМА ГРАМАДЗЯНСКАЙ СУПОЛЬНАСЦІ УСХОДНЯГА ПАРТНЁРСТВА

*12 снежня 2012 г.*
*Мінск, Рэспубліка Беларусь*

*Мы, удзельнікі Нацыянальнай платформы Форума грамадзянскай супольнасці Усходняга партнёрства, выказваем глыбокую занепакоенасць з нагоды чарговай серыі рэпрэсіўных дзеянняў з боку беларускай улады ў дачыненні беларускіх арганізацый грамадзянскай супольнасці, іх прадстаўнікоў і партнёраў, незалежных журналістаў і творчых суполак, а таксама рэлігійных абшчынаў Беларусі.*

26 лістапада 2012 года офіс Праваабарончага цэнтра “Вясна” быў канфіскаваны ў адпаведнасці з несправедлівым палітычна матываваным прысудам, вынесеным Алесю Бяляцкаму год таму. Гэтыя дзеянні з’ўляюцца чарговым парушэннем свабоды асацыяцый з боку беларускіх уладаў, працягваюцца ціск на іншадумцаў і спробы запалохаць і паставіць праваабаронцаў па-за законам. **Мы патрабуем ад беларускіх уладаў неадкладна вызваліць Алеся Бяляцкага, адмяніць несправядлівыя рашэнні суда аб канфіскацыі маёмасці, а таксама спыніць практыку пераследу праваабаронцаў і прадставіць ім гарантаваныя Канстытуцыяй і законамі Беларусі правы на вядзенне запатрабаванай грамадствам праваабарончай дзейнасці.**

На працягу 2012 года ў краіне працягваецца непрымальная практыка крымінальнага пераследу журналістаў, незалежных выданняў і творчых моладзевых суполак. Мы лічым, што такія дзеянні наносяць непапраўную шкоду беларускай культуры і інтэлектуальнай супольнасці, і **патрабуем канчатковага спынення крымінальнага пераследу журналіста Андрэя Пачобута, выказваем занепакоенасць з нагоды ціску на інтэлектуальны часопіс “Архэ” і пераслед яго галоўнага рэдактара Валеркі Булгакава, заклікаем Мінгарвыканкам адмовіцца ад ганебнай практыкі ціску на арэндадаўцаў і прадставіць магчымасць Адкрытай культурніцкай пляцоўцы “Арт-Сядзіба” бесперашкодна арэндаваць памяшканне для сваёй дзейнасці.**

**Мы выказваем рашучы пратэст супраць пераследу ўладамі грамадскіх актывістаў і настойваем на спыненні крымінальнага пераследу і іх неадкладным вызваленні, а таксама спыненні практыкі ціску, неабгрунтаваных праверак, часовага прыпынення дзейнасці і ліквідацыі шэрагу незалежных арганізацый грамадзянскай супольнасці,** у прыватнасці прыкладаў апошніх месяцаў – Інфармацыйна-асветніцкай установы ”Платформа” і Грамадскага аб’яднання “Добрая воля”. Мы таксама заклікаем да аб’ектыўнага расследвання і непрадузятага разгляду справы актывіста моладзевай суполкі «Саюз маладых інтэлектуалаў» Андрэя Гайдукова, затрыманага ў Віцебску 8 лістапада 2012 г.

У другой палове 2012 года замежныя партнёры беларускіх арганізацый грамадзянскай супольнасці сутыкаюцца са шматлікімі штучна створанымі праблемамі пры атрыманні беларускіх візаў, а таксама спробах наведвання Беларусі для сустрэч са сваімі калегамі. Апошнія прыклады адмовы ў атрыманні візы старшыні ўправы "Радыё Рацыя" і галоўнаму рэдактару Тыднёвіка беларусаў у Польшчы "Ніва" Яўгену Вапу, сябру Вялікай Рады Згуртавання беларусаў свету «Бацькаўшчына», старшыні Таварыства беларускай культуры ў Літве Хведару Нюньку, гісторыку і старшыні Беларускага таварыства «Хатка» ў Гданьску Лене Глагоўскай, а таксама іншым партнёрам з Германіі, Швецыі, Даніі, Нарвегіі, Польшчы, Літвы і іншых краін з'яўляюцца непрымальнымі для сучаснай практыкі міжнародных зносін, наносяць непапраўную шкоду іміджу краіны ў вачах міжнароднай супольнасці. **Мы патрабуем неадкладна спыніць практыку нематываваных перашкодаў у ажыццяўленні міжнароднага супрацоўніцтва грамадскіх арганізацый Беларусі са сваімі партнёрамі, якая дэманструе закрытасць і рэпрэсіўны характар беларускіх уладаў у дачыненні да прадстаўнікоў міжнароднай грамадзянскай супольнасці.**

**Мы шчыра вітаем спыненне судаводства ў дачыненні да рэлігійнай абшчыны хрысціянаў поўнага Евангелля «Царква «Новае жыццё». Заклікаем адпаведныя службовыя асобы Мінгарвыканкама і Маскоўскага раёна г. Мінска адмовіцца ад сваіх прэтэзій да царквы "Новае жыццё", прадставіць кіраўніцтву абшчыны дакументы на права ўласнасці на памяшканне і гарантаваць вернікам магчымасць бесперашкодна рэалізоўваць сваё права на свабоду сумлення.**

7 снежня 2012 г. Аляксандрам Лукашэнкам падпісаны Дэкрэт № 9 «Аб дадатковых мерах па развіцці дрэваапрацоўчай прамысловасці». Гэты дакумент замацоўвае новыя формы прымусовай працы, якія упершыню ўсталяваны ў 1999 годзе Дэкрэтам №29 "Аб дадатковых мерах па ўдасканаленню працоўных адносін, умацаванню працоўнай і выканаўчай дысцыпліны". Цяпер датэрміновае скасаванне кантрактаў дапускаецца толькі са згоды наймальніка (раней была умова – "па ўзгадненню бакоў"). Упершыню, за ўвесь час найноўшай гісторыі Беларусі створаны ўмовы, пры якіх работнік абавязаны працаваць пад прымусам і выплочваць дзяржаве грошы толькі за тое, што ён звольніўся альбо яго звольнілі. **Мы звяртаем увагу уладаў Беларусі на тое, што гэтыя дэкрэты парушаюць працоўныя правы беларускіх грамадзян і заклікаем неадкладна адмяніць Дэкрэт №29 і Дэкрэт №9, паколькі яны супярэчаць Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, Працоўнаму Кодэксу краіны, міжнародным абавязацельствам Рэспублікі Беларусь у галіне правоў чалавека.**

Подпісы:

*Уладзімір Мацкевіч*, Старшыня Каардынацыйнага камітэта Нацыянальнай платформы Форума грамадзянскай супольнасці Усходняга партнёрства

*Уладзіслаў Вялічка*, сябра КК Нацыянальнай платформы Форума грамадзянскай супольнасці Усходняга партнёрства, Міжнародны кансорцыум «ЕўраБеларусь»

*Пётр Кузняцоў,* сябра КК Нацыянальнай платформы Форума грамадзянскай супольнасці Усходняга партнёрства, *«Гомельскі Дэмакратычны Форум»*

*Сяргей Драздоўскі,* сябра КК Нацыянальнай платформы Форума грамадзянскай супольнасці Усходняга партнёрства, Асветніцкая праваабарончая ўстанова «Офіс па правах людзей з інваліднасцю»

*Юры Губарэвіч*, , сябра КК Нацыянальнай платформы Форума грамадзянскай супольнасці Усходняга партнёрства, Праваабаронча-асветніцкае грамадскае аб'яднанне "Рух "За Свабоду"

*Вольга Смалянка*, сябра КК Нацыянальнай платформы Форума грамадзянскай супольнасці Усходняга партнёрства, Асветніцкая ўстанова «Цэнтр прававой трансфармацыі»

*Яраслаў Бекіш*, сябра Кіруючага камітэта Форума грамадзянскай супольнасці Усходняга партнёрства, сябра КК Нацыянальнай платформы Форума

*Андрэй Ягораў*, Цэнтр еўрапейскай трансфармацыі

*Яўген Бойка*, Грамадзянская ініцыятыва “Магілёўская адукацыйная ініцыятыва”

*Ігар Лялькоў*, Грамадскае аб’яднанне "БНФ "Адраджэньне"

*Дзмітрый Гамянюк*, Інфармацыйна-асветніцкая ўстанова "ГЕДЭЎС"

*Таццяна Пашэвалава,* Грамадскае аб’яднанне “Цэнтр сацыяльных інавацый”

*айцец Леанід Акаловіч,* Беларуская Аўтакефальная Праваслаўная Царква

*Ірына Капарыха*, Грамадскае аб’яднанне “Экадом”

*Ірына Сухій*, Грамадскае аб’яднанне “Экадом”

*Аляксандр Каралевіч*, Грамадскае аб’яднанне "Адукацыйны цэнтар "ПОСТ"

*Дзіна Шаўцова,* юрыст

*Міраслаў Кобаса*, Асветніцкае грамадскае аб’яднанне "Фонд імя Льва Сапегі"

*Валадар Цурпанаў,* Ініцыятыва "Рушаньне.Магілёўская лучнасьць"

*Анатоль Швяцоў*, Грамадскае аб’яднанне "Абарона правоў бацькаў і дзяцей"

*Таццяна Вадалажская*, Агенцтва гуманітарных тэхналогій

*Таццяна Зялко*, Грамадскае аб’яднанне беларускіх пенсіянераў "Наша пакаленне"

*Сяргей Дзяжурка*, Культурна-асветніцкае грамадскае аб’яднанне "Гуманітарны мост"

*Святлана Каралёва,* Нацыянальны савет дзіцячых і моладзевых арганізацый "РАДА"

*Алесь Крот*, Маладзёвая прафсаюзная група "Студэнцкая Рада"

*Вітаўт Руднік,* Грамадскае аб’яднанне "Цэнтр "Трэці сектар"

*Іна Кулей*, Асветніцка-дабрачынная установа “Камітэт "Салідарнасць"

*Ігар Леднік*, Праваабарончы рух "Наша Беларусь"

*Ірына Жыхар*, Грамадскае аб’яднанне “Беларуская арганізацыя працоўных жанчын”